**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ А. І. Жук
02. 05. 2014 г.

Рэгістрацыйны нумар № ТД-Д.302/тып.

**Уводзіны ў літаратуразнаўства**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках);
1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках);
1-21 05 04 Славянская філалогія;
1-21 05 05 Класічная філалогія;
1-21 05 06 Рамана-германская філалогія;
1-21 05 07 Усходняя філалогія

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
______________ А. Д. Данільчанка
21. 02. 2014 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
______________ С. І. Раманюк
02. 05. 2014 г.

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па вучэбна-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
______________ І. У. Цітовіч
10. 03. 2014 г.

Эксперт-нормакантралёр
А.В. Краузе
10. 03. 2014 г.

Мінск 2014

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**Рагойша В.П.** – загадчык кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;

**Кенька М.П.** – дацэнт кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

**Марозава Т.А.** – дацэнт кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра беларускай літаратуры Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы»;

**Васілевіч У. А.** – дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ**:

Кафедрай тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 5 ад 21 студзеня 2013 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 4 ад 11 сакавіка 2013 г.)

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 3 ад 21 лютага 2013 г.).

Адказны за рэдакцыю:
Адказны за выпуск: Кенька М. П.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Уводзіны ў літаратуразнаўства» распрацавана згодна з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях:

1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках);
1-21 05 02 Руская філалогія (па напрамках);
1-21 05 04 Славянская філалогія;
1-21 05 05 Класічная філалогія;
1-21 05 06 Рамана-германская філалогія;
1-21 05 07 Усходняя філалогія.

Студэнты валодаюць пэўнымі пазнаннямі з гісторыі літаратуры (найперш беларускай і рускай) і тэорыі літаратуры, атрыманымі ў сярэдняй школе. Ва ўніверсітэце, дзякуючы вучэбнай дысцыпліне «Уводзіны ў літаратуразнаўства», адбываецца сістэматызацыя гэтых пазнанняў, значнае іх паглыбленне і пашырэнне. Тыпавая вучэбная праграма, абапіраючыся на ранейшыя веды, у той жа час пераасэнсоўвае некаторыя палажэнні і катэгорыі або, наадварот, вяртае ім першапачатковае тлумачэнне, імкнецца падаць у новай інтэрпрэтацыі асобныя паняцці літаратуразнаўства, у адпаведнасці з дасягненнямі сучаснай навукі пра мастацкую літаратуру. Веды, атрыманыя па ўводзінах ў літаратуразнаўства, раскрываюць перад студэнтамі ўвесь спектр галоўных і дапаможных літаратуразнаўчых дысцыплін, а таксама садзейнічаюць больш глыбокаму і арганічнаму засваенню такіх курсаў, як «Гісторыя літаратуры дзяржавы вывучаемай мовы», «Гісторыя замежнай літаратуры». Разам з тым уводзіны ў літаратуразнаўства – своеасаблівы трамплін да курса «Тэорыя літаратуры», які яшчэ у большай ступені арыентаваны на дыскусійныя праблемы тэорыі і метадалогіі. «Тэорыя літаратуры» – гэта ўжо у значнай ступені аўтарскі курс. І таму дадзеная тыпавая вучэбная праграма, змяшчаючы неабходныя тыпавыя палажэнні, не імкнецца набыць жорсткі імператыўны характар. Тым больш, што літаратуразнаўчая тэрміналогія змяняецца не толькі з часам, але і мае неадназначнасць ў розных навуковых школах.

# МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КУРСА

Тыпавая вучэбная праграма мае на мэце дапамогу студэнтам у авалоданні асноўнымі прынцыпамі аналізу літаратурнага твора ў яго мастацкай цэласнасці і своеасаблівасці, што спатрэбіцца пазней, пры напісанні курсавой работы па літаратуры, а таксама ў часе працы над дыпломнымі праектамі. Урэшце, удакладненыя тэарэтыка-літаратурныя веды

як нельга лепш прыдадуцца для педагагічнай, навуковай, рэдактарскай і літаратурна-крытычнай дзейнасці спецыяліста-філолага.

Мэта вучэбнай дысцыпліны – пазнаёміць студэнтаў з асновамі літаратуразнаўчай навукі.

Задачы:

1) сістэматызаваць і паглыбіць атрыманыя ў школе веды па тэорыі літаратуры, дапамагчы студэнтам пераасэнсаваць некаторыя палажэнні і катэгорыі або, наадварот, вярнуць ім першапачатковае тлумачэнне, асобныя паняцці літаратуразнаўства падаць у новай інтэрпрэтацыі, у адпаведнасці з дасягненнямі сучаснай навукі пра мастацкую літаратуру;

2) якасна павялічыць аб'ём паняційнага інструментарыя, неабходнага для вывучэння гісторыі літаратур;

3) сфарміраваць разуменне арганізацыі мастацкага твора як структурнага аб'яднання элементаў зместу і формы;

4) навучыць практыцы цэласнага і выбарачнага аналізу літаратурна-мастацкага твора.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– асноўныя тэарэтычныя паняцці, звязаныя з эстэтыкай і паэтыкай літаратурнага твора, літаратурным працэсам;
– сістэму літаратуразнаўчых дысцыплін і іх сувязі з іншымі гуманітарнымі навукамі і дапаможнымі галінамі літаратуразнаўства;
– спецыфічныя асаблівасці эпасу, лірыкі і драмы як родаў літаратуры, вершаванай і празаічнай формы выказвання, асноўныя складнікі стылю пісьменніка.

***умець:***

– вызначаць асноўную ідэйную накіраванасць, тэматыку, праблематыку, пафас літаратурных твораў;
– разглядаць літаратурны твор у арганічным адзінстве яго зместу і формы;
– вызначаць асаблівасці стылю пісьменніка, супастаўляць творчыя індывідуальнасці розных мастакоў слова;
– аналізаваць літаратурны твор, выяўляць яго вартасці і магчымыя недахопы;

***валодаць:***

– належным комплексам сучасных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў і паняццяў, асноўнымі прынцыпамі аналізу літаратурных твораў, неабходнымі для глыбейшага спасціжэння гісторыка-літаратурных

курсаў, напісання курсавых, семінарскіх і дыпломных прац па літаратуры.

## МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

У працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» выкарыстоўваюцца наступныя метады навучання:

1. Вуснае выкладанне інфармацыі выкладчыкам і актыўная пазнавальная дзейнасць студэнтаў (лекцыя, аповед, тлумачэнне, ілюстрацыя, дэманстрацыя). Замацаванне вывучаемага матэрыялу.
2. Самастойная работа студэнтаў па асэнсаванні і замацаванні вывучаемага матэрыялу (праца з арыгінальнымі мастацкімі тэкстамі, навуковымі працамі, энцыклапедыямі, слоўнікамі, выкананне дамашніх заданняў).
3. Выпрацоўка уменняў і навыкаў самастойнага стварэння студэнтамі паэтычных і празаічных мастацкіх твораў.

У адпаведнасці з тыпавымі вучэбнымі планамі на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства» адведзена максімальна **128** гадзін, па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія», 1-21 05 05 «Класічная філалогія» – **52 гадзіны** аўдыторных заняткаў (**30** – лекцыі, **22** – практычныя заняткі); па спецыяльнасцях 1-21 05 06 «Рамана-германская філалогія», 1-21 05 07 «Усходняя філалогія» - **50 гадзін** аўдыторных заняткаў (**36** – лекцыі, **14** – практычныя заняткі).

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**
для спецыяльнасцей 1-21 05 01 «Беларуская філалогія (па напрамках)»,
1-21 05 02 «Руская філалогія (па напрамках)»,
1-21 05 04 «Славянская філалогія», 1-21 05 05 «Класічная філалогія»

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| I. | **Літаратуразнаўства як навука**<br>Сістэма ведаў пра літаратуру | 2 | | 2 |
| | З гісторыі літаратуразнаўства | 2 | | 2 |
| | Метадалагічныя праблемы літаратуразнаўства | 2 | | 2 |
| II. | **Эстэтыка літаратуры**<br>Агульнае і рознае ў мастацка-эстэтычным і навуковым пазнанні жыцця | 2 | 2 | 4 |
| | Мастацтва і грамадскае жыццё | 2 | 2 | 4 |
| | Літаратура як від мастацтва | 4 | 2 | 6 |
| III. | **Паэтыка**<br>Паэтыка як навуковая дысцыпліна. Літаратурныя роды, віды, жанры | 2 | | 2 |
| | Літаратурны твор як мастацкае цэлае. Змест і форма. Змест твора і яго кампаненты | 2 | 2 | 4 |
| | Вобразны свет твора. Спосабы характарыстыкі і сродкі стварэння тыповага вобраза-персанажа | 2 | 4 | 6 |
| | Асновы вершазнаўства | 4 | 4 | 8 |
| | Стыль мастацкага твора | 2 | 2 | 4 |
| IV. | **Тэорыя літаратурнага працэсу**<br>Разуменне літаратурнага працэсу | 2 | 2 | 4 |
| | Літаратурныя сувязі. Мастацкі пераклад | 2 | 2 | 4 |
| Усяго | | 30 | 22 | 52 |

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
для спецыяльнасці 1-21 05 06 «Рамана-германская філалогія»,
1-21 05 07 «Усходняя філалогія»

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| I. | **Літаратуразнаўства як навука**<br>Сістэма ведаў пра літаратуру | 2 | | 2 |
| | З гісторыі літаратуразнаўства | 4 | | 4 |
| | Метадалагічныя праблемы літаратуразнаўства | 2 | 2 | 4 |
| II. | **Эстэтыка літаратуры**<br>Агульнае і рознае ў мастацка-эстэтычным і навуковым пазнанні жыцця | 2 | | 2 |
| | Мастацтва і грамадскае жыццё | 2 | | 2 |
| | Літаратура як від мастацтва | 4 | | 4 |
| III. | **Паэтыка**<br>Паэтыка як навуковая дысцыпліна. Літаратурныя роды, віды, жанры | 2 | 2 | 4 |
| | Літаратурны твор як мастацкае цэлае. Змест і форма. Змест твора і яго кампаненты | 2 | 2 | 4 |
| | Вобразны свет твора. Спосабы характарыстыкі і сродкі стварэння тыповага вобраза-персанажа | 4 | 2 | 6 |
| | Асновы вершазнаўства | 4 | 2 | 6 |
| | Стыль мастацкага твора | 2 | | 2 |
| IV. | **Тэорыя літаратурнага працэсу**<br>Разуменне літаратурнага працэсу | 2 | | 2 |
| | Літаратурныя сувязі. Мастацкі пераклад | 4 | 4 | 8 |
| Усяго | | 36 | 14 | 50 |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА ЯК НАВУКА

### Сістэма ведаў пра літаратуру

Сутнасць ведаў пра літаратуру. Літаратуразнаўства як філалагічная навука пра сутнасць, своеасаблівасць, гістарычныя заканамернасці развіцця, сацыякультурную ролю і прынцыпы аналізу мастацкай літаратуры. Абгрунтаванне самастойнасці і паўнавартаснасці літаратуразнаўства як асобнай навукі, якая мае ўласны *прадмет* даследавання, сваю *тэрміналогію* і *методыку* даследавання. Сувязь яго з іншымі гуманітарнымі навукамі – мовазнаўствам, эстэтыкай, фалькларыстыкай, гісторыяй, філасофіяй, мастацтвазнаўствам, журналістыкай, культуралогіяй, псіхалогіяй.

*Галоўныя галіны літаратуразнаўства.*

*Гісторыя літаратуры* і яе раздзелы: аўтаразнаўства, гісторыя нацыянальных літаратур, гісторыя рэгіянальных літаратур, гісторыя сусветнай літаратуры. *Тэорыя літаратуры* як своеасаблівая «матэматыка літаратуры» і яе раздзелы: эстэтыка літаратуры, паэтыка, тэорыя літаратурнага працэсу, літаратуразнаўчая метадалогія. *Літаратурная крытыка* і яе раздзелы: тэорыя крытыкі, гісторыя крытыкі. Узаемасувязь паміж галоўнымі галінамі літаратуразнаўства. М. Чарнышэўскі і І. Франко пра агульнае і рознае ў тэорыі і гісторыі літаратуры, гісторыі літаратуры і літаратурнай крытыцы. Літаратурная крытыка як памежнае звяно паміж літратуразнаўствам і мастацкай літаратурай. Крытык як пісьменнік.

*Дапаможныя галіны літаратуразнаўства.*

*Палеаграфія, археаграфія, літаратурнае архівазнаўства, краязнаўства, крыніцазнаўства. Бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Гісторыяграфія і храналогія. Кнігазнаўства. Тэксталогія*, яе сутнасць і задачы.

Асобныя ўнутрыгаліновыя і міжгаліновыя напрамкі сучаснага літаратуразнаўства. Сутнасць і задачы *вершазнаўства, перакладазнаўства, кампаратывістыкі, герменеўтыкі, функцыянальнага літаратуразнаўства, псіхалогіі творчасці.*

### З гісторыі літаратуразнаўства

Зараджэнне ведаў пра літаратуру ў працах філосафаў і мысляроў старажытных Індыі, Кітая, Грэцыі, Рыма. Погляды на літаратуру і мастацтва Платона (427–347 гг. да н. э.), Арыстоцеля (384–322 гг. да н. э.), Гарацыя (І ст. да н. э.). Увага да пытанняў, звязаных з гісторыяй і тэорыяй літаратуры ў часы Сярэдневякоўя, Адраджэння і Асветніцтва. «Паэтычнае мастацтва» француза Н. Буало (1674) як кодэкс палажэнняў класіцызму, яго крытыка ў працах нямецкага асветніка Г. Э. Лесінга «Лаакаон» (1766) і «Гамбургская драматургія» (1769). Узнікненне ў XVIII ст. літаратуразнаўства як асобнай навукі, канчатковае выдзяленне яго з філасофіі . Развіццё тэарэтыка-

літаратурнай думкі ў XVIII–XIX ст. у працах Д. Дзідро, М. Ламаносава, І. Канта, Г. Гегеля, рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў (В. Бялінскі, М. Дабралюбаў, М. Чарнышэўскі), І. Франко і інш. Уклад літаратуразнаўцаў XIX і XX стст., у тым ліку вучоных-славістаў (А. Патабня, А. Весялоўскі, Д. Ліхачоў, В. Жырмунскі, М. Бахцін, Ю. Лотман, М. Гаспараў і інш.), у развіццё навукі пра літаратуру. Вядучыя беларускія літаратуразнаўцы (Ф. Скарына, Я. Карскі, М. Багдановіч, М. Гарэцкі, А. Луцкевіч, В. Ластоўскі, Я. Барычэўскі, М. Ларчанка, А. Адамовіч, В. Каваленка, І. Ралько, У. Гніламёдаў, М. Мушынскі, А. Лойка, А. Яскевіч і інш.) і іх асноўныя літаратуразнаўчыя працы.

Метадалагічныя праблемы літаратуразнаўства

Вытокі гэтых праблем у гісторыі сусветнай эстэтычнай думкі і літаратурна-мастацкай крытыкі, абумоўленасць іх разуменнем сутнасці, паходжання, гістарычнага развіцця і грамадскага значэння мастацтва слова. Уплыў філасофскіх канцэпцый на літаратуразнаўчую метадалогію. Адрозненне метадалогіі навуковага пошуку ад методыкі аналізу літаратурных з'яў.

*Галоўныя прынцыпы аналізу мастацкіх твораў*: эстэтычны, гістарызму, сістэмнасці, цэласнасці, паяднання аналізу з сінтэзам.

Асноўныя *навуковыя напрамкі і школы* ў літаратуразнаўстве XIX–XX ст.ст. (міфалагічная, культурна-гістарычная, псіхалагічная, фенаменалагічная школы, біяграфічны, параўнальна-гістарычны, фармальны, сацыялагічны метады і інш.). Аналіз мастацкай літаратуры метадамі сацыялогіі, гісторыі, культуралогіі, псіхалогіі, лінгвістыкі, семіётыкі, кібернетыкі і яго недастатковасць. Суадносіны дэтэрмінізму і іманентнасці пры вывучэнні мастацкай літаратуры. Праблема цэласнага аналізу літаратурнага твора.

Гістарычная зменлівасць літаратуразнаўчых паняццяў (тэрмін «эпіграма» ў Старажытнай Грэцыі і ў Новы час, паняцці «паэзія», «літаратура» ў XIX ст. і цяпер і г. д.), мнагазначнасць некаторых тэрмінаў («драма» як род і від літаратуры, «верш» як рытмічна арганізаваны спосаб маўлення і як вершаваны твор і г. д.). Неадэкватнасць разумення асобных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў рознымі даследчыкамі мастацкай літаратуры («метад», «напрамак», «від», «жанр» і г. д.).

Праблемы вывучэння гісторыі і тэорыі літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе Рэспублікі Беларусь. Падрыхтоўка літаратуразнаўчых кадраў, месца іх працы. Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі («Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» ў 4-х тамах, 5-і кнігах; «Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей» у 4-х тамах; біябібліяграфічны даведнік «Беларускія пісьменнікі» ў 6-і тамах; Поўныя зборы твораў М. Багдановіча ў 3-х тамах і Янкі Купалы ў 9-і тамах, 10-і кнігах і інш.).

# 2. ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ

Агульнае і featureнае ў мастацка-эстэтычным і навуковым пазнанні жыцця

*Прадмет і аб’ект* мастацкага і навуковага пазнання (мадэлявання) рэчаіснасці. Чалавек як прадмет мастацкага пазнання, паколькі творчасць мастака (што б ні з’яўлялася аб’ектам яго выяўлення) – пра чалавека, для чалавека, у імя чалавека. Літаратура як «чалавеказнаўства» (Максім Горкі).

*Змест* пазнання ў навуцы (матэрыяльны і духоўны свет безадносна да суб’екта пазнання) і ў мастацтве (духоўны і матэрыяльны свет ва ўзаемадачыненнях з суб’ектам пазнання). Рэчаіснасць (пры ўсёй часамі «фантастычнасці» твора) у яе цэласнасці, шматбаковасці, канкрэтнасці і агульнацікавасці як змест мастацкага пазнання. Агульнацікавасць як адна з перадумоў мастацкага пазнання (у адрозненне ад навуковага).

*Сродак* пазнання: лагічны довад, сілагізм – у навуцы; вобраз – у мастацтве. Вобразная прырода мастацтва. Вобраз – уяўленне – паняцце. Адзінства ў мастацкім вобразе прадметнага і ідэальнага, канкрэтнага і ўмоўнага, індывідуальнага і абагульненага, эмацыянальна-экспрэсіўнага і рацыянальнага. Вобраз – «знаёмы незнаёмец» (В. Бялінскі). Вобраз і знак, мадэль, схема. Мастацтва як «мысленне вобразамі». Аксіялагічнае значэнне вобраза, яго самадастатковасць у мастацтве, выкарыстанне яго як дапаможнага сродка (у выглядзе ілюстрацыі) у літаратуры навуковай і дакументальнай, у публіцыстыцы і рэкламе. Роля творчай фантазіі ў стварэнні вобраза.

*Даўгавечнасць* твораў навукі і мастацтва, Нязменнасць у часе і прасторы выдатных твораў мастацтва і зменлівасць (абмежаванасць пры выкарыстанні, удакладненне, замена іншымі, больш дасканалымі, і г. д.) твораў навукі (нават выдатных адкрыццяў, законаў і інш.).

*Мэты (функцыі)* мастацкага і навуковага пазнання. Агульнае і рознае ў асобных функцыях: пазнавальнай, эстэтычнай, геданістычнай, выхаваўчай, эўрыстычнай, прагнастычнай, этнагенетычнай (нацыятворчай, мовазахавальнай), камунікатыўнай.

Мастацтва і грамадскае жыццё

*Узаемаўплыў мастацтва і грамадскага жыцця.* Уплыў мастацтва на рэчаіснасць праз яго канкрэтныя функцыі (выхаваўчую, пазнавальную, этнагенетычную і інш.). Уплыў рэчаіснасці на мастацтва. *Светапогляд мастака* як асноўны «канал» гэтага ўплыву. Умовы і працэс фарміравання светапогляду як сістэмы поглядаў на навакольны свет, сукупнасць пераконанняў, ідэалаў пэўнага чалавека. Канкрэтна-гістарычны, сацыяльна-класавы і нацыянальны характар грамадскага і эстэтычнага ідэалаў мастака.

Маральна-этычныя, эстэтычныя, філасофскія, сацыялагічныя, рэлігійныя пошукі мастака і іх выяўленне ў тэматыцы, праблематыцы, ідэйнай скіраванасці, пафасе творчасці. Тыпалогія мастацкіх ідэй паводле тэматычнага прынцыпу: сацыяльныя, палітычныя, маральна-этычныя,

рэлігійныя, нацыянальна-патрыятычныя і інш. Аўтарская ідэя і аб'ектыўная ідэя твора, разыходжанне (часамі) паміж імі, прычыны гэтага разыходжання.

*Ідэйнасць і безыдэйнасць, ідэалагізацыя і дэідэалагізацыя. Тэндэнцыйнасць. Грамадзянскасць.* Разуменне грамадзянскасці мастака А. Пушкіным, М. Някрасавым, Я. Купалам і інш. Крытыка «чыстага мастацтва», «мастацтва для мастацтва». *Пафас мастака* як «ідэя-страсць» (В. Бялінскі), якой ён служыць, якая прадвызначае кірунак усіх яго ідэйна-мастацкіх пошукаў.

*Мастацкасць* як спецыфічная ўласцівасць сапраўдных твораў мастацтва і як паказчык іх дасканаласці. Прыгажосць, ісціна, дабро – тры састаўныя часткі мастацкасці. Паняцце *народнасці* творчасці пісьменніка.

## Літаратура як від мастацтва

*Першабытнае мастацтва*, яго сінкрэтычны характар, сувязь з магіяй, рытуалам, міфалогіяй. Паступовае выдзяленне з яго іншых відаў мастацтва (музыка, харэаграфія і інш.), у тым ліку – мастацтва слова. Узнікненне вусна-паэтычнай творчасці як асобнай галіны творчай дзейнасці, суадносіны ў ёй калектыўнага і індывідуальнага пачаткаў, захоўванне дачыненняў да сінкрэтычнага старажытнага мастацтва (магія, рытуал). Роля міфалагем у развіцці мастацкай вобразнасці. Мастацтва як стварэнне новых («культурных») міфаў. Гульнёвы пачатак у мастацтве.

*Фальклор* – аснова мастацкай літаратуры як выразна індывідуальнай аўтарскай творчасці. Узаемазалежнасць і ўзаемаўплыў фальклору і мастацкай літаратуры раней і цяпер.

*Падзел мастацтваў на асобныя віды*, крытэрыі гэтага падзелу. Мастацтвы прасторавыя (жывапіс, графіка, скульптура, архітэктура), ча́савыя (музыка, харэаграфія, літаратура), прасторава-ча́савыя (тэатр, кінамастацтва, музычныя шоў). Узнікненне новых відаў мастацтва дзякуючы развіццю тэхнікі (тэлевізійнае мастацтва), сувязі мастацтва з немастацтвам (сінхроннае плаванне, фігурнае катанне, карнавальныя шэсці і інш.).

Падзел мастацтваў на віды паводле іх галоўнага сродку вобразнага пазнання (мадэлявання) рэчаіснасці: музыка – мастацтва гуку; харэаграфія – мастацтва танца; жывапіс – мастацтва лініі і фарбы і г. д. Сінтэтычныя мастацтвы: тэатр (драматычны, опера, балет), кіна- і тэлемастацтва і інш. Літаратура як мастацтва слова.

*Мова* – не толькі сродак зносін, а «матэрыял і інструмент пісьменніка» (Я. Колас). Своеасаблівасць і перавага мастацтва слова ў параўнанні з іншымі відамі мастацтва – прасторавымі і ча́савымі. Літаратура як дынамічнае мастацтва, яе магчымасці ў паказе з'яў у іх дынаміцы, ад зараджэння да заканчэння. «Нярэчыўнасць» слова, яго знакавасць, дэнататыўная (сэнсавая) і канататыўная (эмацыянальна-экспрэсіўная) сутнасць. Зварот пісьменніка да «ўнутранага вока» (М. Гогаль) успрымальніка літаратурна-мастацкага твора. *Слова і вобраз.* Вучэнне А. Патабні пра слова-вобраз, яго «знешнюю» і «ўнутраную» форму і значэнне, пра падобнасць стварэння слова і мастацкага макрасвету. Здольнасць літаратуры ствараць па-за слоўны малюнак з'яў і

прадметаў, перадаваць як жывое маўленне чалавека, так і знешнія моманты яго жыцця. «Магія слова», яго рытмічнасць, музычнасць, эўфанічная выразнасць, экспрэсіўнасць. Здольнасць літаратуры перадаць унутраны свет чалавека (пачуцці, перажыванні, думкі) у іх непасрэднай канкрэтыцы і дакладнасці.

*Пісьменнік як адзін з асноўных стваральнікаў, узбагачальнікаў і захавальнікаў «душы народа» – яго мовы.* «Мукі слова». Лексікон пісьменніка, залежнасць яго ад таленавітасці творцы, сувязі яго з жывымі крыніцамі народнага маўлення, відавой і жанравай разнастайнасці творчай дзейнасці і інш. Моўны і мастацка-вобразны свет літаратурнага твора і магчымасці яго адэкватнага ўспрымання чытачом (слухачом). Праблема пісьменніцкага і чытацкага полілінгвізму. Пераўвасабленне твора ў мастацкім перакладзе, захаванне ў ім стылёвых адметнасцей пісьменніка і нацыянальна-моўных адметнасцей арыгінала.

Літаратура ў яе сувязях з іншымі відамі мастацтва (тэатр, кіно, тэлемастацтва). В. Бялінскі пра літаратуру як «*вянец мастацтваў*», паколькі яе сродак – слова – «ёсць і гук, і малюнак, і пэўнае яскрава вымаўленае ўяўленне. Таму паэзія заключае ў сабе элементы іншых мастацтваў, нібы карыстаецца раптам і непадзельна ўсімі сродкамі, якія дадзены паасобку кожнаму з іншых мастацтваў».

*Пісьменнік як творчая асоба.* Літаратурныя здольнасці, талент – асноўная перадумова творчасці. Роля суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў (адукацыя, працаздольнасць, засваенне вопыту знакамітых папярэднікаў і сучаснікаў і інш.) у развіцці пісьменніцкага таленту, выніках літаратурнай працы. Псіхалогія творчасці, уплыў на творчы працэс псіхафізіялагічных, сацыякультурных, грамадска-палітычных і матэрыяльных чыннікаў. Шматстайнасць форм увасаблення мастацтва слова. Асаблівасці літаратурнага таленту і асноўныя формы яго рэалізацыі: *паэзія, проза, драматургія.* Віды літаратурнай дзейнасці (у шырокім разуменні): *літаратура мастацкая, дакументальная, дыдактычная, эпісталярная, публіцыстыка, літаратурная крытыка, мастацкі пераклад.* Розныя формы слоўна-мастацкага выказвання: *празаічны і вершаваны, суб'ектыўны і аб'ектыўны, аповедны і апісальны, маналагічны і дыялагічны.*

Этапы творчага працэсу: задума твора, творчы акт, сувязь яго з натхненнем, апрацоўка твора, успрыманне яго чытачамі і крытыкамі, магчымая дапрацоўка. «Сутворчасць» чытача ў працэсе ўспрымання літаратурнага твора.

## 3. ПАЭТЫКА

### Паэтыка як навуковая дысцыпліна. Літаратурныя роды, віды, жанры

*Паэтыка* як 1) літаратуразнаўчая дысцыпліна, што вывучае структуру, характэрныя асаблівасці і змястоўнасць літаратурна-мастацкай формы; 2) абумоўленая ідэйнай задумай мастака сістэма спосабаў і сродкаў

вобразнага спасціжэння свету ў іх змястоўнай, сэнсавыяўленчай сутнасці. *Раздзелы паэтыкі*: *агульная* – разглядае ўсе спосабы і сродкі ўвасаблення аўтарскай задумы ў адпаведнасці з магчымасцямі літаратуры як мастацтва слова (літаратурныя роды, віды, жанры, мастацкая мова, строфіка і г. д.); *функцыянальная (апісальная)* – даследуе эстэтычныя кампаненты пэўнага твора, аўтара, літаратурнага напрамку ці перыяду (паэтыка А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Я. Купалы; рамантызму, сімвалізму; старажытнарускай літаратуры; беларускага рамана ХХ ст. і г. д.); *гістарычная* – вывучае паходжанне і эвалюцыю мастацкіх кампанентаў твора, літаратурных відаў і жанраў (метафара, сімвал, сістэмы вершавання і г.д.) у залежнасці ад сацыяльна-гістарычных і чыста літаратурных умоў; *параўнальная* – займаецца тыпалагічным супастаўленнем спосабаў і сродкаў мастацка-вобразнага асэнсавання жыццёвага матэрыялу дзвюма ці больш нацыянальнымі літаратурамі (параўнальная метрыка ўсходнеславянскага верша, еўрапейскага рамана і г. д.); *практычная* – скіравана на стварэнне розных дапаможнікаў па агульнай паэтыцы дзеля выхавання паэтычнай культуры, азнаямлення чытачоў з асновамі мастацтва слова. Суадносіны тэарэтычнай і гістарычнай паэтыкі. Цесная сувязь паміж літаратуразнаўствам і лінгвістыкай пры вывучэнні паэтыкі мастацкага твора. Узнікненне паэтыкі як навукі ў Старажытнай Грэцыі («Пра мастацтва паэзіі» Арыстоцеля), Індыі, Кітая. Нарматыўная паэтыка (працы Гарацыя, Н. Буало, В. Традзьякоўскага, М. Ламаносава). Развіццё паэтыкі ў працах Г. Лесінга, В. Гумбальта, рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў (В. Бялінскага, М. Дабралюбава, М. Чарнышэўскага, А. Герцэна), А. Патабні, А. Весялоўскага, І. Франко, Дз. Ліхачова і інш. Узнікненне ў пачатку ХХ ст. *сацыялагічнай* і *фармальнай* паэтыкі, а на аснове апошняй – *структурнай і лінгвістычнай* (Ю. Тынянаў, Б. Эйхенбаўм, М. Бахцін, В. Шклоўскі, В. Жырмунскі, В. Вінаградаў, Ю. Лотман і інш.). Уклад вучоных Беларусі ў развіццё паэтыкі (Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, М. Сарбеўскі, М. Багдановіч, Я. Барычэўскі, А. Вазнясенскі і інш.).

*Эпас, лірыка, драма – роды мастацкай літаратуры і фальклору*, іх паходжанне і развіццё. Дыскусійнасць падзелу літаратуры на роды, віды і жанры, непрыняцце некаторымі даследчыкамі паняцця «віду», змяшэнне ўжывання «роду» і «жанру» і г. д. Платон, Арыстоцель, В. Бялінскі, асобныя сучасныя літаратуразнаўцы пра падзел літаратуры на роды. Спроба аднесці да родаў літаратуры сатыру, публіцыстыку. Адзінства суб'ектыўнага і аб'ектыўнага, таго, што выяўляецца і як выяўляецца, пры пазнанні з'яў і стварэнні эстэтычнай рэчаіснасці сродкамі мастацтва слова. *Своеадметнасць літаратурных родаў* паводле 1) аб'екта выяўлення: падзея – у эпасе, пачуцці – у лірыцы, дзеянне – у драме; 2) вядучай формы выказвання: празаічная мова – у эпасе, вершаваная – у лірыцы, дыялагічная – у драме; 3) адносін аўтара да таго, што ім выяўляецца: эпік стаіць збоку ад тых падзей, пра якія апавядае; лірык выяўляе пачуцці праз сваё суб'ектыўнае «Я»; драматург усё перадавярае дзейным асобам, прысутнасць яго мы адчуваем толькі ў нешматлікіх рэпліках і рэмарках. Узаемасувязь паміж рознымі родамі літаратуры. Адрозненне ад эпасу, лірыкі і драмы як родаў літаратуры

эпічнасці, лірызму, драматызму, публіцыстычнасці як эмацыйнай танальнасці твораў.

Правамернасць увядзення паняцця *віду літаратуры* як унутрыродавай і міжродавай катэгорыі, якая ўказвае на форму літаратурнага твора паводле яго некаторых структурных кампанентаў (архітэктанічных, кампазіцыйных, моўных, метрычных і інш.). Асноўныя *віды фальклорных твораў*: паэмы-эпапеі, казкі, легенды, паданні, песні, анекдоты, прыказкі і прымаўкі, загадкі. *Віды эпасу* як роду мастацкай літаратуры і іх сутнасць: раман, аповесць, апавяданне, навела, нарыс, абразок, эсэ, гумарэска, фельетон, памфлет, мастацка-публіцыстычны артыкул. *Віды лірыкі*: песня, лірычны верш з усімі яго «цвёрдымі формамі» (санет, трыялет, актава, тэрцыны, рандо, рандэль, хоку, танка, рубаі і інш.) і разнавіднасцямі (акраверш, александрыйскі верш, элегічны двуверш, цэнтон і г.д.). *Віды драмы*: камедыя, трагедыя, уласна драма.

*Жанр літаратурны* як гістарычна акрэслены, адносна ўстойлівы тып мастацкай формы, дзе структура пэўных фармальных прыкмет (архітэктанічных, вобразных, моўных) выяўляе больш-менш канкрэтны мастацкі сэнс. Генетычная сувязь паміж жанравай формай і пэўным зместам, здольнасць яе «адчужацца» ад апошняга і выражаць новы змест (першапачаткова выключна інтымны змест санетаў Дантэ і Петраркі і – філасофскія санеты Шэкспіра, цыклы “турэмных санетаў” І. Франко, сатырычныя санеты А. Звонака і г. д.). Імкненне некаторых літаратуразнаўцаў (Г. Паспелаў) размежаваць жанравую форму і жанравы змест. Жанры старажытнай літаратуры (слова, апокрыф, жыціе, прытча і інш.), вуснай народнай творчасці (казкі – чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя, пра жывёл і інш.; песні – каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, жартоўныя і інш.). *Жанры асобных відаў сучаснага эпасу і драмы*: раманы і драмы – сямейна-бытавыя, сацыяльна-бытавыя, гістарычныя, псіхалагічныя, філасофскія, прыгодніцкія, фантастычныя, сатырычныя, дэтэктыўныя, утопіі, антыўтопіі і інш. *Жанравы падзел лірыкі* на інтымную, грамадзянскую, духоўную, пейзажную, філасофскую, медытатыўную, сугестыўную. Шматстайнасць і асаблівая развітасць асобных жанравых утварэнняў у лірыцы: творы філасофска-медытатыўныя (медытацыя, элегія, пасланне, стансы, ямбы, філасофскі верш), велічальныя (ода, дыфірамб, мадрыгал, эпітафія, эпіталама), песенныя (раманс, гімн, марш, серэнада, баркарола, альба, верш-песня), сатырычна-выкрывальныя (эпіграма, пародыя, інвектыва, сатыра).

*Дыфузія родаў, відаў і жанраў.* Узнікненне міжродавых і міжвідавых утварэнняў. *Міжродавыя ўтварэнні.* Ліра-эпас і яго віды: паэма, вершаваны раман, вершаваная аповесць, вершаванае апавяданне, балада, дума, версэт, вершаказ, лірычная проза. Ліра-драма і яе віды: драматычная паэма, драматычны абразок. Ліра-драма-эпас: байка, “драма для чытання”, кіна- і тэлесцэнарый. *Міжвідавыя ўтварэнні*: трагікамедыя, меладрама, трагіфарс. *Жанравыя разнавіднасці* ў фальклоры (каляндарна-абрадавыя песні – калядкі, вяснянкі, валачобныя, купальскія, асеннія і інш.; сямейна-абрадавыя –

вясельныя, радзінныя, калыханкі і інш.) і ў мастацкай літаратуры (фэнтэзі, трылер, сатырычныя оды, рамансы, замовы і інш.).

Жанр як своеасаблівая «памяць мастацтва» (М. Бахцін). Устойлівасць і гістарычная зменлівасць жанраў і жанравых разнавіднасцей. Узаемадзеянне і ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных літаратур шляхам запазычання і «нацыяналізацыі» асобных відаў і жанраў літаратуры як мастацтва слова.

<u>Літаратурны твор як мастацкае цэлае. Змест і форма. Змест твора і яго кампаненты</u>

*Паняцце пра літаратурны твор* як вынік немеханічнай, адухоўленай дзейнасці аўтара. Літаратурны твор – асноўны аб'ект літаратуразнаўчага вывучэння, які валодае цэласнасцю і ўнутранай завершанасцю. Твор як самадастатковая адзінка літаратурнага развіцця, якая характарызуецца закончаным ідэйным і эстэтычным сэнсам, у адрозненне ад сваіх складнікаў – тэмы, ідэі, сюжэта, маўлення і інш., што атрымліваюць сэнс і могуць існаваць толькі ў сістэме цэлага. Літаратурны твор валодае аб'ектыўнасцю (узнаўленне рэчаіснасці) і суб'ектыўнасцю (яе аўтарскае разуменне), якія складаюць два аспекты мастацкай дзейнасці пісьменніка. Прынцыповае значэнне для літаратурна-мастацкага твора наяўнасці *катэгорыі аўтара.* Адрозненне аўтара як рэальна-біяграфічнай асобы і аўтара як катэгорыі літаратуразнаўчага аналізу, пад якім маецца на ўвазе носьбіт ідэйнай канцэпцыі твора. Паняцце *вобраз аўтара,* яго разнавіднасці: «вобраз самога сябе», фіктыўны аўтар.

*Змест і форма* як кампаненты структуры мастацкага твора. Арганічнае адзінства вобразнай формы і эмацыянальна-абагульненага зместу. Праблема іх размежавання, якая ўзнікла ў еўрапейскай эстэтыцы ў XVIII–XX стст. Неабходнасць такога размежавання на сучасным этапе развіцця літаратуразнаўчай навукі. Тэрміналагічнае вызначэнне *зместу* як духоўнага пачатку ў творы, «выказвання» пісьменніка пра свет, пэўнай эмацыянальнай і мысліцельнай рэакцыі на з'явы рэчаіснасці, і *формы* як матэрыяльнага пачатку твора, той сістэмы сродкаў і прыёмаў, у якой дадзеная рэакцыя знаходзіць сваё выяўленне. Аргументацыя першаснасці зместу ў дачыненні да формы твора. Структурнасць і ўзаемападпарадкаванасць як аспекты суадносінаў паміж зместам і формай. Прасторавая злітнасць і непадзельнасць зместу і формы ў творы. Творчая прырода мастацкага зместу і формы ў працэсе зараджэння твора («пераход» зместу ў форму і формы ў змест).

Разуменне *тэмы* як аб'екта мастацкага ўзнаўлення, жыццёвых характараў і сітуацый, якія быццам бы пераходзяць з рэчаіснасці ў мастацкі твор і ўтвараюць аб'ектыўны бок яго зместу. Тэматыка як пераходнае звяно паміж светам рэальным і светам мастацкім. Асаблівасці змястоўнага аналізу твора: 1) разгляд аўтарскага асэнсавання ўзноўленага, 2) адрозненне аб'екта ўзнаўлення (тэмы) і аб'екта адлюстравання (канкрэтнай адлюстраванай сітуацыі), 3) размежаванне тэм канкрэтна-гістарычных і вечных, пад якімі

маюцца на ўвазе, з аднаго боку, узнаўленне характараў, падзей і сітуацый, якія адбываюцца ў гістарычна абмежаваны адрэзак часу і не паўтараюцца за межамі дадзенага часу, больш ці менш лакалізаваныя; па-другое, фіксацыя такіх момантаў ў жыцці нацый і пакаленняў, якія ў разнастайных мадыфікацыях паўтараюцца ў розныя эпохі.

*Праблема* як сфера разумення, асэнсавання пісьменнікам узноўленай рэчаіснасці і суб'ектыўны бок твора, як праяўленне аўтарскай канцэпцыі свету і чалавека, у якой занатоўваюцца роздумы і перажыванні пісьменніка, а тэма разглядаецца пад пэўным вуглом бачання. Разуменне цэнтральнай праблемы як арганізуючага пачатку, які пранізвае ўсе элементы зместу твора. Тыпы праблематыкі (па класіфікацыі Г. Паспелава): 1) міфалагічная (аўтарскае тлумачэнне ўзнікнення пэўных з'яў), характэрная для фальклору, старажытнай літаратуры, навукова-фантастычных твораў і літаратуры «фэнтэзі»; 2) нацыянальная (разглядае сутнасць нацыянальнага характару, гістарычныя лёсы народнасцей і станаўленне дзяржаўнасці, пераломныя моманты ў гісторыі народа), 3) соцыякультурная (асэнсоўвае ўласцівасці і якасці, характэрныя асяроддзю, звяртае ўвагу на ўстойлівыя грамадскія адносіны), пры якой у творы могуць акцэнтавацца ці палітычныя моманты, ці маральны стан грамадства, ці рысы паўсядзённага быту і культуры народа; 4) раманная-авантурная (увага звернута на дынаміку знешніх змен ў лёсе гароя) і раманная-ідэйна-маральная (закранае глыбінныя асновы чалавечай асобы, яго маральныя і этычныя пошукі), 5) філасофская (асэнсоўвае ўніверсальныя заканамернасці быцця прыроды і чалавека, разглядае розныя пункты гледжання на свет практычна безадносна да іх носьбітаў).

*Ідэя* – галоўная абагульняючая эмацыянальна-вобразная думка твора, галіна мастацкіх рашэнняў, сфера, у якой становяцца зразумелымі аўтарскія адносіны да свету, аўтарская пазіцыя, сцвярджаецца ці адмаўляецца аўтарам пэўная сістэма каштоўнасцей. Каштоўнасны аспект і эмацыянальная накіраванасць ідэі, абумоўленая светапогляднымі, маральнымі і эстэтычнымі адносінамі аўтара да адлюстраваных супрацьлегласцей чалавечага жыцця. Розная ступень выражанасці аўтарам эмацыянальнай ацэнкі ў цэласнасці мастацкага твора (у залежнасці ад творчых задач аўтара, жанравых і стылёвых патрэб). Спосабы знаходжання ідэі ў творы: непасрэднае фармуліраванне аўтарам ў змесце (напрыклад, у байках) ці ў архітэктоніцы (напрыклад, у эпіграфе), ці выказанае персанажам, ці (у большасці выпадкаў) «разлітая» ва ўсім творы.

Разуменне *пафасу* як вядучага эмацыянальнага тону твора. Тэрміналагічная сінанімія: «эмацыянальна-каштоўнасная арыентацыя» (Г. Паспелаў), аўтарская эмацыянальнасць (В. Халізеў), «згустак, ядро пэўнага светасузірання» (А. Андрэеў) Сутнасныя характарыстыкі тыпалагічных разнавіднасцей пафасу – *драматычнага, трагічнага, рамантычнага, гераічнага, сентыментальнага, сатырычнага, гумарыстычнага, іранічнага*. Падабенства і адрозненне пафасаў драматызму – трагізму, героікі – рамантыкі, сатыры – гумару – іроніі. Стасункі героікі з драматызмам і трагізмам. Значэнне антычных міфаў і хрысціянскіх легенд у асэнсаванні сутнасці трагічных канфліктаў. Шматлікасць сітуацый, якія

адлюстроўваюць трагізм у жыцці. Ідылічнае як мастацкая ідэалізацыя натуральнага, блізкага да прыроды ладу жыцця. Сентыментальная і рамантычная цікавасць да ўнутранага жыцця чалавека. Прынцыповае адрозненне паняццяў «сентыментальнасць» і «рамантыка» ад назваў мастацкіх метадаў «рамантызм» і «сентыменталізм». Узаемасувязі сентыментальнасці і рамантыкі з гумарам, сатырай, іроніяй. Катэгорыя камічнага ў літаратуры. Гумар як спроба маральнага асэнсавання камічных паводзінаў людзей. Грамадская накіраванасць сатыры як выкрыцця заганаў праз смех. Сарказм. Скептыцызм як жыццёвая аснова іроніі. Іронія і сатыра: адрозненні.

Пафас як гісторыка-тыпалагічны бок метаду, стратэгія мастацкай тыпізацыі. Віды пафасу па класіфікацыі А. М. Андрэева: гумар – сатыра, ідылія – героіка, драматызм – трагізм, іронія. Віды іроніі: саркастычная, камічная, рамантычная, трагічная.

## Вобразны свет твора. Спосабы характарыстыкі і сродкі стварэння тыповага вобраза-персанажа

*Віды вобразаў* у літаратурным творы:

1) *вобраз-рэч* – тыя рэчы, якія выконваюць у творы пэўную мастацкую функцыю: сюжэтную, псіхалагічную, сімвалічную;

2) *вобраз-пейзаж*;

3) *вобразы жывёл і птушак*;

4) *вобраз чалавека*. Тэрміналагічная сінанімія ў залежнасці ад рода літаратуры: *герой, вобраз-персанаж, дзейная асоба* – у драматычным родзе літаратуры; у эпічным родзе літаратуры разам з названымі вобразамі прысутнічаюць *апавядач* (у вялікіх па аб'ёме творах), *апавядальнік/расказчык* (у малых і сярэдніх па аб'ёме творах); толькі *лірычны герой* – у лірычным родзе літаратуры (у аповеднай лірыцы магчыма прысутнасць дзейных асоб); *герой, вобраз-персанаж, дзейная асоба, лірычны герой*, аб'яднаны з апаведачом у адной асобе, вобразы чалавека ў ліра-эпасе. *Разнавіднасці вобразаў-персанажаў*: рэальныя асобы, гістарычныя, аўтабіяграфічныя, вымысленыя, але якія маюць прататыпаў, гратэскныя, фантастычныя, рэчы-персанажы, з'явы прыроды, абстрактныя паняцці;

4) *вечныя вобразы*, якія пераходзяць з эпохі ў эпоху;

5) *вобраз краіны і народа.*

*Віды вобразаў па характару сэнсавай абагульненасці:*

1) *індывідуальныя, непаўторныя* (з'яўляюцца вынікам уяўлення пісьменніка. Сустракаюцца ў рамантыкаў і пісьменнікаў-фантастаў);

2) *хара́ктарныя* (абагульненыя, у іх змяшчаюцца рысы характараў і нораваў, уласцівых многім людзям пэўнай эпохі і яе грамадскіх сфер);

3) *тыповыя* (вышэйшая ступень вобраза хара́ктарнага; тыповае – найбольш паказальнае, заканамернае для пэўнай эпохі; вечныя вобразы, якія спалучаюць як сацыяльна-гістарычныя прыкметы эпохі, так і

агульначалавечыя рысы характару героя);

4) *вобразы-матывы і топасы* (выходзяць за межы індывідуальных вобразаў: *матыў* – тэма, якая ўстойліва паўтараецца ў творчасці пісьменніка; *топас* абазначае агульныя і тыповыя вобразы, ён характэрны для літаратуры цэлай эпохі, нацыі);

5) *архетыпы* (агульначалавечыя вобразы, якія несвядома перадаюцца з пакалення ў пакаленне: вобразы міфалагічных герояў (Праметэй), агульначалавечыя сімвалы – агонь, неба, дом, шлях і г. д.);

6) *міфалагемы / міфемы* (уключаюць у сябе як міфалагічныя вобразы, так і міфалагічныя сюжэты ці іх часткі: міфалагема жаночай долі ў беларускім фальклоры, што ўзыходзіць да грэчаскіх багінь лёсу Мойраў, і г. д.).

*Спосабы характарыстыкі* таго ці іншага персанажа: а) аповед ад першай асобы, калі герой расказвае пра сябе сам, самараскрываецца, і ад трэцяй асобы; б) дзённік героя: шчырае, адкрытае выказванне пра ўнутраныя перажыванні і падзеі жыцця героя (распрацаваны ў сентыменталістаў); в) перапіска герояў або пасланні; г) расказ ад імя староннягa героя.

*Сродкі стварэння вобраза-персанажа:* 1) паказ дзеянняў, учынкаў персанажа; 2) мова персанажа; 3) партрэт; 4) прамая аўтарская характарыстыка; 5) характарыстыка вуснамі іншых дзейных асоб; 6) рэчыўны свет, паказ абстаноўкі, якая акружае персанажа; 7) пейзаж; 8) псіхалагічная характарыстыка; 9) вымоўнае прозвішча (гаваркое імя).

Крытэрыі класіфікацыі сістэмы персанажаў. Персанажы галоўныя, другасныя і эпізадычныя, функцыі другасных і эпізадычных персанажаў.

Паняцце пра *ўзноўлены свет* твора як змадэляваную аўтарам рэчаіснасць. Кампаненты ўзноўленага свету: мастацкія дэталі, хранатоп. Мастацкія дэталі знешнія (партрэт, пейзаж, свет рэчаў) і ўнутраныя (псіхалагічныя), іх функцыі. Віды партрэту: партрэт-апісанне, партрэт-параўнанне, партрэт-ураженне, псіхалагічны. Паняцце пра *псіхалагізм* як непасрэднае глыбокае ўзнаўленне ўнутранага свету героя, яго думак, перажыванняў, жаданняў, пачуццяў. Яго прынцыповае адрозненне ад *формаў псіхалагічнага адлюстравання* ў творы: ускоснай (фіксацыя знешніх праяў псіхікі праз выраз твару, цэларухі і г. д.) і сумарна-вызначальнай (лаканічнае называнне працэсаў, што адбываюцца ва ўнутраным свеце). Прыёмы псіхалагізму, іх сутнасныя характарыстыкі (па класіфікацыі А. Есіна): аповед ад першай і ад трэцяй асобы, псіхалагічны аналіз і самааналіз, унутраны маналог, умаўчанне.

*Мастацкі час і мастацкая прастора* ў творы (паняцце пра *хранатоп*). Уласцівасці літаратурных хранатопаў у адрозненне ад іншых відаў мастацтва: здольнасць адлюстроўваць дзеянне адначасова ў розных месцах, свабодны пераход з адной часавай плыні ў другую, дыскрэтнасць (перарыўнасць) як сродак дынамізацыі сюжэта твора, умоўнасць як рыса, цесна звязаная з родавай прыналежнасцю твора (максімальная ўмоўнасць хранатопа назіраецца ў лірыцы, мінімальная – у эпасе, прамежкавая – у драме).

*Мова* мастацкага твора. Маўленчая арганізацыя твора і маўленчая характарыстыка персанажаў. Мова як важнейшы сродак стварэння вобраза-персанажа. Агульныя ўласцівасці мастацкай мовы: празаічнасць – вершаванасць, маналагізм – рознагалоссе, намінатыўнасць – рытарычнасць.

*Стылістычныя зрэзы твора*: лексіка ўзвышаная, зніжаная, нейтральная. Сродкі ўзбагачэння мовы твора: 1) сістэма прамых значэнняў слоў (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы, іх функцыі); 2) словы рознага моўнага асяроддзя (гістарызмы, архаізмы, неалагізмы/аказіяналізмы, жарганізмы, прафесіяналізмы, варварызмы, дыялектызмы), іх функцыі; 3) тропы (агульнамоўныя і аўтарскія), іх функцыі. Эпітэт, яго віды (характарызуючы, пастаянны, метафарычны), метафара і яе віды (увасабленне, персаніфікацыя, метанімія, сінекдаха, перыфраза, гіпербала, літота), алегорыя, гратэск, сімвал, аксюмарон і інш.

*Сінтаксіс і інтанацыя* як важнейшыя маўленчыя сродкі мастацкай літаратуры. Сінтаксіс і інтанацыя ў прозе: паняцце пра колан (рытміка-інтанацыйны адрэзак тэксту, выдзелены з двух бакоў паўзамі) і тэмпарытм (функцыя якога – ствараць пэўную эмацыянальную атмасферу ў творы). Прыёмы паэтычнага сінтаксісу: паўторы (анафара, эпіфара, кальцо, падваенне, шматзлучнікавасць, шматпрыназоўнікавасць), парушэнні звычайнай і лагічнай сувязі паміж словамі (інверсія, анакалуф, эліпсіс, амфібалія, недасказ), супастаўленне і супрацьпастаўленне радкоў (паралелізм, перанос, антытэза, ампліфікацыя), рытарычныя фігуры (рытарычнае пытанне, рытарычны зваротак, рытарычны воклiч).

*Гукапіс (фоніка).* Асноўныя віды гукапісу, іх мастацкая функцыя: алітэрацыя, асананс, гукаперайманне.

Паняцце пра <u>*кампазіцыю*</u> ў шырокім (структура мастацкай формы) і ў вузкім (склад і размяшчэнне частак, элементаў і вобразаў твора ў некаторай часавай паслядоўнасці) значэннях. Кампазіцыя ўнутраная (уласна кампазіцыя) і знешняя (архітэктоніка), іх структурныя адзінкі. Прызначэнне архітэктанічнай кампазіцыі. Эпіграф, пралог, прадмова, эпілог, назва твора. Унутраная кампазіцыя. *Сюжэт і фабула*: сутнаснае размежаванне паняццяў.

*Канфлікт* як па-мастацку значная супярэчнасць, рухавік сюжэта. Суадносіны ў творы сюжэта, фабулы, канфлікту. Віды канфлікту: 1) паміж персанажамі ці іх групамі, 2) паміж персанажам і асяроддзем, 3) псіхалагічны. Тыпы канфлікту: лакальны (вырашальны) і субстанцыяльны (невырашальны – ці на дадзены адрэзак часу, ці ўвогуле). Сюжэтныя элементы як стадыі развіцця канфлікту. Тэрміналагічная сінанімія: *кампазіцыя сюжэту, кампаненты сюжэта.* Экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка. Пазасюжэтныя элементы твора, іх функцыі ў творы: 1) апісанні партрэтныя, пейзажныя, рэчыўныя; 2) аўтарскія адступленні (лірычнага, філасофскага, аўтабіяграфічнага характару); 3) устаўныя эпізоды (адносна закончаныя фрагменты тэксту). *Тыпы сюжэтаў*: канцэнтрычны, хранікальны, шматлінейны (па Г. Паспелаву); дынамічны, адынамічны (па А. Есіну).

*Кампазіцыйныя прыёмы*: паўтор на мікра- і макраўзроўнях (кальцавая кампазіцыя), узмацненне (градацыя, ампліфікацыя), супрацьпастаўленне (антытэза, кантраст), кантамінацыя (люстраная кампазіцыя), мантаж, рэтраспекцыя і інш. Просты (адна сюжэтная лінія) і складаны (некалькі сюжэтных ліній) тыпы кампазіцыі твора.

## Асновы вершазнаўства

*Проза, верш, паэзія.* Адрозненне паэзіі ад проста верша, выдатныя вучоныя і літаратары (Арыстоцель, А. Пушкін, В. Бялінскі, А. Твардоўскі і інш.) пра гэтае адрозненне. Азначэнне верша. Стаўленне некаторых празаікаў (Л. Талстога, М. Салтыкова-Шчадрына і інш.) да вершаванага спосабу літаратурна-мастацкага выказвання. Верш – знешняе ўвасабленне, своеасаблівая "мова" паэзіі як мастацтва слова.

*Вершаваны рытм.* Разуменне вершаванага рытму як раўнамернага чаргавання аднародных моўных з'яў. Функцыі рытму: генетычная, эмоцыестваральная, сэнсавыяўленчая, мнеманічная. Рытм і *метр.* Рытм і *вершаваны памер.*

*Сістэмы вершавання,* залежнасць іх ад прасадычных уласцівасцей мовы, літаратурных традыцый. *Метрычная (антычная) сістэма,* яе сутнасць, асноўныя памеры (гекзаметр, пентаметр), уплыў на пазнейшы еўрапейскі верш і вершазнаўства.

*Танічная сістэма вершавання.* Народны танічны верш, яго рытм, сувязь з мелодыяй, напевам. Узнікненне і бытаванне літаратурнага танічнага верша ў славянскай паэзіі. Віды танічнага верша: акцэнтна-складовы, (у тым ліку кальцоўскага тыпу і каламыйкавы), дольнік, тактавік, акцэнтны (чыста танічны). Верш Маякоўскага. Месца літаратурнага танічнага верша ў сучаснай паэзіі.

*Сілабічнае вершаванне.* Яго сутнасць, гісторыя бытавання ў еўрапейскай і ўсходнеславаянскай паэзіі. Асноўныя рытмастваральныя кампаненты (жаночыя клаўзулы, рыфма, цэзура) і памеры. Рэформа Традзьякоўскага-Ламаносава.

*Сілаба-танічнае вершаванне.* Азначэнне сілаба-танічнага верша, яго асноўныя і неасноўныя (дапаможныя) рытмастваральныя кампаненты. Станаўленне сілаба-тонікі ў рускай і беларускай паэзіі. Своеасаблівасць, месца і роля сілаба-тонікі ў сучаснай еўрапейскай паэзіі, яе вялікія выяўленчыя магчымасці.

*Свабодны верш (верлібр).* Азначэнне верлібра, яго рытмастваральныя кампаненты. Узнікненне і бытаванне свабоднага верша ў сусветнай, рускай і беларускай паэзіі. Абмежаванне ў верлібры рытмічнай свабоды трыма межамі: ідэйна-тэматычнай (узрастанне філасафічнай напоўненасці твора), вобразнай (узмацненне аналітычнай ролі мастацкага вобраза, канцэнтрацыя вобразнага мыслення) і інтанацыйнай. Перспектывы верлібра.

*Рыфміка.* Вызначэнне *рыфмы*, яе месца ў вершаванні. Віды рыфмы: па месцы націску (мужчынскія, жаночыя, дактылічныя, гіпердактылічныя), па ступені сугучнасці (дакладныя, багатыя, каранёвыя, анаграмныя і інш.), па іх навізне (багатыя, бедныя, аднародныя, экзатычныя і інш.). *Рыфмоўка.* Віды рыфмоўкі: паводле спалучэння рыфмамі вершаваных радкоў (сумежная, перакрыжаваная, апаясная), па колькасці рыфмаў (парная, трайная, чацвярная, манарыфма), па месцы

размяшчэння рыфмаў (пачатковая, канцавая, унутраная, ланцужковая, ламаная, пантарыфма).

*Строфіка.* Азначэнне страфы, чыннікі, якія вызначаюць яе сутнасць: рыфмоўка або клаўзацыя, рытмічная аднатыпнасць вершаваных радкоў, іх інтанацыйна-сінтаксічная завершанасць. Вершы страфічныя і астрафічныя. Страфічная арганізацыя верша: рыфмова-клаўзальная схема, від страфы, мадэль страфы. Страфоіды. *Простыя строфы.* Друхрадкоўі (бейт, элегічны двуверш), выкарыстанне двухрадкоўяў у газэлі. Трохрадкоўі (тэрцэты) і трохрадковікі. Японскія хоку (хайку) і іх імітацыі ў славянскай паэзіі. Тэрцэты ў складзе цвёрдых формаў верша (віланэля, санет, тэрцыны, рытурнэль). Чатырохрадкоўі (катрэны) і чатырохрадковікі. Віды чатырохрадковікаў: прыпеўка, айрэн, рубаі, туюг. Пяцірадкоўі (квінцілы) і пяцірадковікі. Японская танка, ірландскі лімэрык і іх адаптацыя ва ўсходнеславянскай паэзіі.

*Класічныя віды строфаў.* Віды складаных строфаў (ад шасці да шаснаццаці радкоў). Шасцірадкоўе (секстэт) і яго віды: рансарава страфа, секстына, секстына лірычная. Сямірадкоўе (септыма) і сямірадковік. Васьмірадкоўе (актэт) і яго віды: актава, трыялет, сіцыліяна. Дзевяцірадкоўе (нона) і спенсерава страфа як яго від. Дзесяцірадкоўе (дэцыма) і яго віды: іспанская дэцыма, або эспінэла, адычная страфа. Адзінаццацірадкоўе. Дванаццацірадкоўе і дванаццацірадковік. Трынаццацірадковік і яго віды: рандэль, рандо. Чатырнаццацірадкоўе і яго віды: санет, анегінская страфа. Шаснаццацірадкоўе і шаснаццацірадковік. Страфічныя комплексы: вянок санетаў, вянок вянкоў санетаў. Гіперстрофы.

### Стыль мастацкага твора

Паняцце пра *стыль* як эстэтычнае адзінства ўсіх элементаў формы твора, што мае на ўвазе падпарадкаванне ўсіх элементаў формы адзінай мастацкай заканамернасці, наяўнасці арганізуючага прынцыпу стылю, які можна знайсці ў любым фрагменце твора. Стылёвыя дамінанты як ілюстрацыя цэласнасці стылю: у галіне адлюстраванага свету – сюжэтнасць, апісальнасць, псіхалагізм, у мастацкім маўленні – маналагізм ці рознагалоссе, намінатыўнасць ці рытарычнасць, верш ці проза, у галіне кампазіцыі – просты і складаны тыпы. Ідэнтыфікацыя аўтарскага стылю ў любым творы і нават фрагменце як на ўзроўні першаснага ўспрымання, так і на ўзроўні аналізу. Стыль як выражэнне аўтарскай арыгінальнасці. Стадыі работы над стылем: 1) усведамленне першаснага ідэйна-эстэтычнага ўражання ад стылю, той агульнай эстэтычнай танальнасці, якая ўвасабляе ў сабе танальнасць эмацыянальную – пафас; 2) вызначэнне заканамернасцей і дамінантаў стылю; 3) супастаўленне стылю дадзенага твора і аўтара з стылямі іншых твораў ці аўтараў.

## 4. ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ

### Разуменне літаратурнага працэсу

Літаратурны працэс як гістарычнае развіццё і функцыянаванне сусветнай літаратуры, нацыянальных літаратур, узаемасувязі, узаемаўплывы,

пераемнасць традыцый. Уплыў на літаратурны працэс гістарычных падзей, сацыяльна-эканамічных змен у грамадстве.

Узаемадзеянне мастацкай літаратуры з іншымі відамі мастацтва, з фальклорам, этнаграфіяй, рэлігіяй, эстэтыкай і філасофіяй. Літаратурная мастацкая сістэма і літаратурны метад. Літаратурныя метады, напрамкі, школы (плыні) – разыходжанні ў трактоўцы гэтых катэгорый у літаратуразнаўстве і эстэтыцы.

Азначэнне *метаду* ў літаратуразнаўстве як сістэмы гістарычна абумоўленых творчых прынцыпаў, якімі кіруюцца пісьменнікі, блізкія па сваёй ідэйна-творчай пазіцыі, пад час працы над сваімі творамі, як сукупнасць прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці ў святле пэўнага эстэтычнага ідэалу. Абумоўленасць творчага метаду часам, светаўспрыманнем, талентам пісьменніка.

Літаратурны *напрамак* як арганізацыйна-творчае адзінства ідэйных рыс у творчасці груп пісьменнікаў у той ці іншы гістарычны перыяд, абумоўленае блізкасцю светаўспрымання, стылю, памкненняў.

Літаратурная *школа* (*плынь*) як самастойнае арганізацыйна-афармленае ўтварэнне, якое мае сваю тэарэтычную платформу, маніфест, праграму, творчыя прынцыпы (Ю. Бораў). Літаратурныя школы: пралеткультаўцы, рапаўцы, аберыуты, Серапіёнавы браты, кубафутурысты, лефаўцы – у Расіі, маладнякоўцы і ўзвышэнцы, бумбамлітаўцы – у Беларусі.

*Стыль* пісьменніка – сістэма вобразаў, эмоцый, паняццяў і думак, выяўленых адметнымі мастацкімі сродкамі. Індывідуальны стыль і творчая манера.

Літаратурны працэс як змена метадаў і напрамкаў, дыялектычнае адзінства традыцый і наватарства ў творчасці.

Фальклорна-міфалагічны перыяд ("эпоха сінкрэтызму" – А. Весялоўскі) як першая стадыя развіцця славеснага мастацтва. Сувязі фальклору і мастацкай літаратуры.

Мастацкія сістэмы Антычнасці і ранняга Сярэднявечча. Гуманістычная літаратура эпохі Адраджэння як мастацкая сістэма. Літаратурныя метады ў еўрапейскіх краінах у XVII-XVIII–пачатку XIX стст.: *класіцызм, сентыменталізм, рамантызам. Рамантызм* як метад і яго напрамкі (класічны, неарамантызм).

*Рэалізм* як метад, што сцвярджае гуманістычныя ідэалы, праўдзівае адлюстраванне рэчаіснасці літаратурай, яе сацыяльную скіраванасць. Пашырэнне цікавасці да ўнутранага свету чалавека, псіхалагізму ў літаратары рэалізму. *Натуралізм. Класічны (крытычны) рэалізм* XIX–XX стст. Неарэалізм.

*Сацыялістычны рэалізм* як літаратурны напрамак, выкліканы спецыфічнымі сацыяльнымі ўмовамі. Асноўная задача сацыялістычнага рэалізму – выхаванне чытача ў духу камуністычных ідэй.

*Мадэрнізм* як літаратурны метад і як сацыяльная з'ява. Напрамкі мадэрнізму: *сімвалізм, футурызм, імажынізм, акмеізм, імпрэсіянізм, экспрэсіянізм.*

*Постмадэрнізм.*

Паняцце пра літаратурны *авангардызм* і *дэкаданс.*

Традыцыі і наватарства ў літаратуры, іх дыялектычная сувязь. Наследаванне, перапеў, стылізацыя, запазычанне, эпігонства як праявы традыцыйнасці і наватарства ў літаратуры.

Уплыў літаратур і твораў ранейшых часоў на літартурны працэс сучанасці. Абнаўленне і эвалюцыя жанравых разнавіднасцей і форм мастацкіх твораў, напаўненне іх новым зместам.

Сусветная літаратура як сукупнасць літаратур розных краін, рэгіёнаў, іх кантакты ў сучасны перыяд. Нацыянальная адметнасць і нацыянальны каларыт мастацкага твора. Арганічнае спалучэнне нацыянальных і інтэрнацыянальных элементаў у літаратурным творы. Стадыяльнасць развіцця літаратуры. Нераўнамернасць развіцця нацыянальных літаратур у сучасным літаратуным працэсе. Паскоранае развіццё літаратуры ў шэрагу краін і рэгіёнаў (Г. Гачаў, В. Каваленка). Пагроза дэнацыяналізацыі літаратур у выніку глабалізацыі. Класіка і белетрыстыка, масавая і элітарная літаратура.

## Літаратурныя сувязі, мастацкі пераклад

Літаратурныя сувязі як форма творчых кантактаў паміж літаратурамі розных народаў, іх стваральнікамі і чытачамі. Віды сувязей: тыпалагічныя, генетычныя, кантактныя. Моўныя фактары літаратурных сувязей: дзяржаўнае двух- або шматмоўе, магчымасці для вывучэння і добрага авалодвання замежнымі мовамі, дастатковая або недастатковая распрацаванасць нацыяанальнай мовы.

*Тыпалагічныя сувязі* як найбольш агульныя разнавіднасці сувязей. Тыпалогія літаратур як аб'ект вывучэння ў літаратуразнаўстве.

*Генетычныя сувязі* – запазычанні, наследаванні, уплывы. Узаемаўзбагачэнне іншакраіннымі літаратурамі новых у сферах сюжэтабудавання, вобразнай тканіны, матываў і жанравых разнавіднасцей твораў, стыляў і метадаў.

*Кантактныя сувязі* – найбольш дзейсны сродак узаемадзеяння літаратур.

Віды пісьменніцкіх сувязей: асабістае сяброўства, ліставанне, з'езды, канферэнцыі, творчыя камандзіроўкі, замежныя паездкі, падарожжы. Міграцыя, дысідэнцтва, праследаванні пісьменнікаў, міжнародныя ваенныя канфлікты, іх уплыў на ўзаемныя кантакты літаратур.

Сувязі пісьменнік–чытач. Спецыфіка ўздзеяння на чытача літаратуры сучаснасці і мінулага. Сувязь паміж чытацкімі пакаленнямі. Працэс успрыняцця літаратуры і ўплыў на чытача літаратурнай крытыкі.

Кнігадрукаванне як магутны каталізатар літаратурных узаемасувязей. Роля сродкаў масавай інфармацыі ў пашырэнні літаратурных сувязей. Выдавецтвы. Літаратурныя часопісы. Навейшыя віды носьбітаў інфармацыі і сродкаў іх запісу.

Роля бібліятэк, універсітэцкіх цэнтраў, навуковых устаноў, культурных асяродкаў, літаратурных суполак, музеяў, архіваў.

Дзяржаўны лад і створаныя ім умовы для літаратурных кантактаў. Культурны ўзровень нацыі як складнік творчых інтарэсаў, стварэнне ўмоў для адукацыі, магчымасцей для азнаямлення са скарбамі сусветнай культуры.

Мастацкі пераклад як адзін з важнейшых сродкаў літаратурных узаемасувязей. Культурныя і моўныя перашкоды ва ўзаемных кантактах літаратур. Мастацкі пераклад і літаратурны працэс. Уплыў перакладаў на развіццё іншанацыянальных літаратур, іх узаемаўзбагачэнне. Гісторыя развіцця мастацкага перакладу – прыклад творчага ўзаемадзеяння культур, абнаўлення традыцый, каталізатар наватарства ў мастацкай літаратуры. Мастацкі пераклад і нацыянальная самабытнасць літаратуры. Мастацкі пераклад у Беларусі, яго спецыфіка.

Мастацкі пераклад – спецыфічны род мастацкай творчсці ў сферы літаратуры. Адрозненне яго ад сінхроннага, камунікатыўнага, машыннага перакладу.

Праблемы адэкватнасці і эквівалентнаці ў мастацкім перакладзе. Моўныя і літаратурныя пытанні тэорыі і практыкі мастацкага перакладу. Гістарычныя разнавіднасці мастацкага перакладу ў працэсе яго развіцця: пераклад вольны, літаралісцкі, рэалістычны. Залежнасць перакладу ад тыпу тэкста (вершаваны, празаічны, эпічны), роду, жанра.

Запатрабавальнасць перакладу, яго залежнасць ад часу, дзяржаўнага ладу, культурнага і адукацыйнага ўзроўню народа. Праблема выбару тэкстаў для перакладу.

Перакладныя творы як частка нацыянальнай літаратуры.

Перспектывы развіцця мастацкага перакладу ў сучасным свеце.

# 5. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура асноўная

Даведачная літаратура

*Лазарук, М. А., Ленсу, А. Я.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. 2-е выд. / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. Мінск, 1996.

*Лесин, В. М., Пулинець, О. С.* Словник літературознавчих термінів / В. М. Лесин, О. С. Пулинець. Київ, 1971.

Літературознавчий словник / редкол.: Р.Т.Гром'як [та інш.]. Київ, 1997.

Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова и П. А. Николаева. М., 1987.

Литературная энциклопедия терминов и понятий / гл. ред. и составитель А. Н. Николюкин. М., 2001.

*Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд. / В. П. Рагойша. Мінск, 2004.

*Рагойша, В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці / В. П. Рагойша. Мінск, 2009.

*Рагойша, В. П.* На шляху да Парнаса: Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. Мінск, 2003.

Речник на литературните термини / Л. Ницолов [и др.]. 4-е изд. София, 1980.

Словарь литературоведческих терминов / ред.-сост. Л.И.Тимофеев и С.В.Тураев. М., 1974.

Энциклопедический словарь юного филолога / редкол.: Г.В.Степанов (глав. ред.) [и др.]. М., 1987.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5-і т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1985–1987.

A Dictionary of Cultural and Critical Theory / Ed. By M. Payne. Oxford, 1998.

Беларуская энцыклапедыя: у 18 тт. / рэдкал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1996–2004.

*Sierotwiński, S.* Słownik terminów literackich / S. Sierotwiński. Wrosław; Warszawa; Kraków; Gdansk, 1966.

Slovník české prozý. 1945–1994. Ostrava, 1991.

Słownik terminów literackich / M. Glowiński [i inny]. Wrosław; Warszawa; Kraków; Gdansk, 1976.

Žilka, T. Poetický slovník / T. Žilka. Bratislava, 1984.

*Tvrtko, Č.* Književni leksikon: osnovni teorijsko-knijiževni pojmovi i biobibliografske bilješke o piscima / Č. Tvrtko. – 3-e izd. – Zagreb, 1972.

*Wood, F.* Dictionary of English Colloquial Idioms / F. Wood, R. Hill. L., 1980.

Вучэбныя дапаможнікі

*Абрамович Г.* Введение в литературоведение / Г. Абрамович. М., 1975.

Введение в литературоведение / под ред. Г. Н. Поспелова. М., 1988.

Введение в литературоведение / под ред. Л. В. Чернец. М., 2004.

Введение в литературоведение: учебник / под ред. Л. М. Крупчанова. М., 2005.
Введение в литературоведение: хрестоматия / под ред. П. А. Николаева. М., 1997.
*Волинський, П. К.* Основи теорії літератури / П. К. Волинський. Київ, 1967.
*Есин, А. Б.* Принципы и приемы анализа литературного произведения / А. Б. Есин. М., 2001.
*Зарев, П.* Теория на литературата: в 2 т. / П. Зарев. София, 1979.
*Майсейчык, Л. А.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: практыкум / Л. А. Майсейчык. Мінск, 1992.
Основы литературоведения / под ред. В. П. Мещерякова. М., 2000.
*Рагойша, В. П.* Беларускае вершаванне: вуч. дапам. / В. П. Рагойша. Мінск, 2011. (Класічнае ўніверсітэцкае выданне).
*Рагойша, В. П.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: вуч. дапам.: у 2 ч. – Ч. 1. / В. П. Рагойша, М. П. Кенька, Т. А. Марозава; пад рэд. В. П. Рагойшы. Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка. Мінск, 2010; Ч. 2. Паэтыка. Тэорыя літаратурнага працэсу. Мінск, 2012.
*Семенюк, Г.* Версифікація: теорія і практика віршування: навч. посібник / Г. Семенюк, А. Гуляк, О. Бондарєва. Київ, 2003.
*Тимофеев, Л.* Основы теории литературы / Л. Тимофеев. М., 1976.
*Ткаченко, А.* Мистецтво слова: вступ до літературознавства / А. Ткаченко. Київ, 1998.
Уводзіны ў літаратуразнаўства: хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. І. Мішчанчук, М. Ф. Шаулоўская. 3-е выд. Мінск, 2004.
*Федотов, О. М.* Основы теории литературы: в 2 ч. / О. М. Федотов. Ч. 1. Литературное творчество и литературное произведение. Ч 2. Стихосложение и литературный процесс. М., 2003.
*Markiewicz, H.* Główne problemy wiedzy o literaturze. 2-e wyd. / H. Markiewicz. Kraków, 1966.
*Štěpánek, V.* Teorie literatury: učebnice / V. Štěpánek [i in.]. Praha, 1965.

<u>Дапаможная літаратура.</u>

*Андреев, А. Н.* Основы теории литературно-художественного творчества: пособ. для студ. филол. фак. / А. Н. Андреев. Минск, 2010.
*Андреев, А. Н.* Целостный анализ литературного произведения / А. Н. Андреев. Минск, 1995.
*Гиршман, М. М.* Стиль литературного произведения / М. М. Гиршман. Донецк, 1984.
*Грехнев, В. А.* Словесный образ и литературное произведение / В. А. Грехнев. Н. Новгород, 1997.
*Корман, Б. О.* Изучение текста художественного произведения / Б. О. Корман. М., 1972.
*Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя: вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. Мінск, 2012.

*Купина, Н. А., Николаева, Н. А.* Филологический анализ художественного текста: практикум / Н. А. Купина, Н. А. Николаева. М., 2003.
*Лазарук, М. А., Ленсу, А. Я.* Пытанні тэорыі літаратуры / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. Мінск, 1964.
*Лотман, Ю. М.* Анализ поэтического текста. Структура стиха / Ю. М. Лотман. М., 1972.
*Лебединский, С. И.* Теория и практика перевода / С. И. Лебединский. М., 2001.
*Мартынава, Э. М.* Мастацкая дэталь у творы / Э. М. Мартынава. Мінск, 1977.
*Маслова, В. А.* Филологический анализ художественного текста / В. А. Маслова. Минск, 2000.
*Мушынскі, М.* Тэксталогія твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа / М. Мушынскі. Мінск, 2007.
Мысль, вооружена рифмами: поэтич. антология по истории русского стиха / сост. В. Е. Холшевников. М., 1983.
*Пяткевіч, А.* Сюжэт. Кампазіцыя. Характар / А. Пяткевіч. Мінск, 1981.
*Ралько, І. Д.* Беларускі верш: пытанні гісторыі і тэорыі / І. Д. Ралько. Мінск, 1969.
*Тимофеев, Л. И.* Основы теории литературы / Л. И. Тимофеев. М., 1976.
*Томашевский, Б. В.* Теория литературы. Поэтика / Б. В. Томашевский. М., 1996.
*Хализев, В. Е.* Теория литературы / В. Е. Хализев. М., 1999.
*Шпакоўскі, І. С.* Структура вершаванага вобраза / І. С. Шпакоўскі. Мінск, 1972.
*Шпакоўскі, І. С.* Тыпізацыя ў лірыцы / І. С. Шпакоўскі. Мінск, 1980.
*Элсанек, А. Я.* Основы литературоведения: анализ художественного произведения / А. Я. Элсанек. М., 2001.
*Яскевич, А. С.* Ритмическая организация художественного текста / А. С. Яскевич. Минск, 1991.
*Brinkmann, K.* Die deutsche Romantik / K. Brinkmann. Hollfeld, 1962.
*Garamaschi, E.* Réalismeet impressionisme dans l'oeuvre des frères Gonsourt / E. Garamaschi. Parie, 1971.
*Ermatinger, E.* Barok und Rokoko in der Dichtung / E. Ermatinger. Leipzig, 1972.
*Tapié, V. L.* Baroque et classicisme / V. E. Tapié. Parie, 1957.
*Hülsweg-Johnen, I.* Neue Sachlichkeit – Magischer Realismus / I. Hülsweg-Johnen. Bielefeld, 1990.

## Літаратура дадатковая

Спецыяльныя даследаванні

*Ауэрбах, Э.* Мимесис / Э. Ауэрбах. М., 1976.
*Багдановіч, М.* Санет: тэарэтыка-гістарычны нарыс // М. Багдановіч. Поўны зб. тв.: у 3 т. Т. 2. Мн., 1993.
*Барт, Р.* Избранные работы: Семиотика. Поэтика / Р. Барт М., 1989.
*Бахтин, М. М.* Вопросы литературы и эстетики / М. М. Бахтин. М., 1975.

*Бахтин, М. М.* Эстетика художественного творчества / М. М. Бахтин. М., 1979.
*Бернштейн, И. А.* Чешский роман XX века и пути реализма в европейских странах / И. А. Бернштейн. М., 1979.
*Боронина, И. А.* Поэтика классического японского стиха VII–XIII вв. / И. А. Боронина. М., 1978.
*Веселовский, А. Н.* Историческая поэтика / А. Н. Веселовский. М., 1989.
*Виноградов, В. В.* Избранные труды: о языке художественной прозы. / В. В. Виноградов. М., 1980.
*Гачев, Г. Д.* Содержательность художественных форм: Эпос. Лирика. Театр / Г.Д. Гачев. М., 1968.
*Гаспаров, М. Л.* Очерк истории европейского стиха / М. Л. Гаспаров. М., 1989.
*Гаспаров, М. Л.* Очерк истории русского стиха / М. Л. Гаспаров. М., 1984.
*Гаспаров, М. С.* Современный русский стих / М. С. Гаспаров. М., 1989
*Гілевіч, Н. С.* Паэтыка беларускіх загадак / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1976.
*Гілевіч, Н. С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1975.
*Гинсбург, Л. Я.* О лирике / Л. Я. Гинсбург. Л., 1974.
*Гинсбург, Л. Я.* О литературном герое / Л. Я. Гинсбург. Л., 1979.
*Гончаров, Б. П.* Звуковая организация стиха и проблема рифмы / Б. П. Гончаров. М., 1973.
*Грынчык, М. М.* Шляхі беларскага вершаскладання / М. М. Грынчык. Мінск, 1973.
*Драздова, З. У.* Моўна-стылявая праблема эпічнага жанру / З. У. Драздова. Мінск, 2001.
*Женнет, Ж.* Фигуры: в 2 т. / Ж. Женнет. М., 1998.
*Жирмунский, В. М.* Теория литературы. Поэтика. Стилистика / В. М. Жирмунский. Л., 1977.
*Жирмунский, В. М.* Теория стиха / В. М. Жирмунский. Л., 1975.
*Жук, І. В.* Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання / І. В. Жук. Гродна, 2003.
*Жураўлёў, В. П.* Структура твора: рух сюжэтна-кампазіцыйных форм / В. П. Жураўлёў. Мінск, 1978.
*Жураўлёў, В. П.* Пытанні паэтыкі / В. П. Жураўлёў, І. С. Шпакоўскі, А. С. Яскевіч. Мн., 1984.
*Калинникова, Е. Я.* Проблемы индийского романа / Е. Я. Калинникова. М., 1974.
*Кин, Д.* Японская литература XVII–XIX столетий / Д. Кин. М., 1978.
*Кравцова, М. Е.* Письменная культура и художественная словесность Китая / М. Е. Кравцова. История культуры Китая. Санкт-Петербург, 1999.
*Ларин, Б. А.* Эстетика слова и язык писателя / Б. А. Ларин. Л., 1974.
*Лессинг, Г. Э.* Лаокоон, или о границах живописи и поэзии / Г. Э. Лессинг. М., 1957.
*Лихачев, Д. С.* Поэтика древнерусской литературы / Д.С.Лихачев. М., 1967.
*Лосев, А. Ф.* Проблема художественного стиля / А. Ф. Лосев. Киев, 1994.

*Лотман, Ю. М.* Структура художественного текста / Ю. М. Лотман. М., 1970.
*Орлицкий, Ю. Б.* Стих и проза в русской литературе / Ю. Б. Орлицкий. М., 2002.
*Потебня, А. А.* Теоретическая поэтика / А. А. Потебня. М., 1990.
*Семанов, В. И.* Эволюция китайского романа / В. И. Семанов. М., 1970.
*Серебряков, И. Д.* Литературный процесс в Индии (VII–XII вв.) / И. Д. Серебряков. М., 1979.
*Скобелев, В. П.* Поэтика рассказа / В. П. Скобелев. Воронеж, 1982.
*Рехо, К.* Современный японский роман / К. Рехо. М., 1977.
*Тамарченко, Н. Д.* Типология реалистического романа / Н. Д. Тамарченко. Красноярск, 1988.
*Тычына, М.* Карані і крона: фальклор і літаратура. 2-е выд. / М. Тычына. Мінск, 2002.
*Тюпа, В. И.* Художественность литературного произведения / В. И. Тюпа. Красноярск. 1987.
*Успенский, Б. А.* Семиотика искусства / Б. А. Успенский. М., 1995.
*Федоров, В. В.* О природе поэтической реальности / М., 1984.
*Флоренский, П. А.* Анализ пространства и времени в художественно-изобразительных произведениях / П. А. Флоренский. М., 1993.
*Фрейденберг О. М.* Миф и литература древности / О. М. Фрейденберг. М., 1978.
*Фрейденберг, О. М.* Поэтика сюжета и жанра / О. М. Фрейденберг. М., 1997.
*Хализев, В. Е.* Драма как род литературы / В. Е. Хализев. М., 1986.
*Черкасский, Л. Е.* Новая китайская поэзия (20–30-е гг.) / Л. Е. Черкасский. М., 1972.
*Черкасский, Л. Е.* Китайская поэзия военных лет / Л. Е. Черкасский. М., 1980.
*Шидфар, Б. Я.* Образная система арабской классической литературы (VI–XII вв.) / Б. Я. Шидфар. М., 1974.
*Шкловский, В. Б.* О теории прозы / В. Б. Шкловский. М., 1983.